25
Д. 081578
395636

Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес —25 к. За граніцэй: на 1 г — 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес. - 1 р. Пер мена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілiя Адрэс і фамілiя толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год IX. 4 Студня 1914 г. № 1

## Прыпамінаем, што пара аднавіць падпіску на 1914 г

*Усіх супрацоўнікоў, чытачоў і прыхільнікоў нашых віншуем з наступіўшым Новым Годам жадаючы шчасьця, здароўя і сілы для працы на карысць Роднаго Краю і сьвятой ідэі культурнаго адраджэньня многамільённаго і многагаротнаго Беларускаго Народу.*

**РЭДАКЦІЯ.**

## На Новы Год.

Чым пацешыш ты нас, Новы Годзе?
Што нясе нам весна малада?
То ня голас пусты у народзе:
То пытае трывога людзкая, беда!

Мы ўзышлі на парог, пазіраем —
Шчыльна дзьверы зам кнёны ад нас;
Ў рад павісьлі замкі... Мы чэкаем,
Бо знаць хочэм скарэй мы пра час,

Як мы ўступім ў той дом, што векамі
Будавалі яго і векамі ішлі,
Усцілаючы сьцежку касьцямі,
Каб ўздыхнуць мы свабодна маглі...

Год настаў, год мінуў - нічагутка,
А ты стаў на парозе ды стой
І с трывогай пытай, ці ёсць чутка
Аб зямельцы, аб праўдзе сьвятой..

Атупелі мы ў нашай нягодзе, —
Холад, голад, гарэлка, суды...
Чым пацешыш ты нас Новы Годзе?
Што нясеш ты нам, год малады?

**Якуб Колас.**

## Голас праўды.

У Пецярбурзі адбываецца з'езд працоўнікоў над прасьветай народу. З усіх канцоў Расейскай дзержавы сабраліся людзі, каторые сілы свае аддаюць на змаганьне с цемнатой. на пашырэньне сьвету. Ёсць тамака працоўнікі ўсіх націй, ды іх грамада німалая: каля сямі тысяч душ!

Ужо самы лік прыехаўшых на з'езд грамадзкіх працоўнікоў паказывае, як справа прасьветы народнай рупіць усе нацыі аграмаднаго гасударства. І праўда: у прамовах вучыцелёў—як расейцоў, так і «інародцоў»—раскрыўся праўдзівы абраз школьнага жыцьця. Народная вучыцелька Гулькевіч раскасала, як цяжка было ей працаваць у Кубанскай абласьці, дзе ўсе яе вучні гукаюць дома па украінску: „Як бы добра ні знала вучыцелька расейскую мову, яна нічога не навучыць дзяцей, калі ня ўмее па іхняму. Нельга вучыць у чужой мове. Гэта-ж сорам,—казала яна,— што сваякі і вучыцелі псуюць дзяцей. Трэба вучыць у роднай мові вучнёў!“ — Гэтак сама гаварылі і вучыцелі-вялікарусы, каторые працуюць у латышскіх і татарскіх школах: жыцьцё паказало ім, што вучучы па расейску яны нічога не навучуць дзяцей. Адзін молдавянскі вучыцель казаў, што школьнікі, пачуўшы расейскіе словы: «косой косят», падумалі, што трэба казаць: «ложкой ложкают», «топором топорают» і т. д. «Дзяцей —казаў ён—проста калечуць!» Іншы ізноў казаў, што вучні зразумелі словы бацюшкі: «лицо Каина исказилось» (твар Каіна зьмяніўся) гэтак: „Каін сказывся“ (па украінску значыць: Каін звар'яцеў). У другой украінскай школі словы Пушкіна: „Крестьянин, торжэствуя, на дровнях обновляет путь“ дзеці зразумелі гэтак: селя не „рождествуют“ (калядуюць) і рубяць дровы перад Калядамі,— адзін хлопчык, катораго спыталіся: хто такі „чыновнік?“ — атказаў: „каторы шкуру чыніт“.

Ня дзіва, што пасьля усяго, гэтаго, пасьля дакладоў вучыцелёў розных націй сэкція (аддзел) з'езду аб «інародзкай» школі пастанавіла некалькі рэзолюцій, у каторых трэбуе, каб школа не калечыла вучнёў, а вучыла-бы іх, карыстаючыся іх роднай матчынай мовай, а расейскай мовы каб вучылі толькі у трэйцім гаду навукі. Асобные рэзолюціі былі аб літоўскай, жыдоўскай, украінскай школі і др.

Для нас, беларусоў, мае асаблівую вагу тое, што з'езд пастанавіў аб украінцах. Справа ў тым, што правые, націоналісты дый казёные пісакі на ўвесь сьвет крычаць, бытцым тые, хто лічыць украінцоў і беларусоў за асобные націі, „дзелюць ядыны. суцэльны расейскі народ“, губяць Расею і т. д. Есць цёмные людзі. што і гэткім брэдням веруць. І вось з'езд паказаў, што лепшые людзі ўсяе дзержавы як-раз наадварот кажуць: яны вераць у творчэскіе сілы прабудзіўшыхся да новаго жыцьця народоў, шануюць гэтые народы і дамагаюцца правоў для іх і для іх роднай мовы у школі і ў жыцьці. Ешчэ адзін сумленны голас падняўся у абарону заціснёных „меншых братоў“— украінцоў і беларусоў, і гэты голас паказывае ўсю брехню, ўвесь фальш гутаркі ворагоў нашаго народу, што нават імя яго хацелі бы зьвесьці са сьвету,— хаця самі урадзіліся пад беларускай стрэхай. Гэта атказ усім перакіньчыкам. што адступіліся ад свайго народу, адракліся роднае мовы.

Ад беларусоў ніхто офіціальна на з'ездзі не гаварыў, хаця і з нашай старонкі ёсць чы мала вучыцелёў, што туды паехалі. Ня дзіва: іншые баяліся. што за сьмелае шчырае слова іх дома спаткаюць цяжкіе кары; іншые не асьмеліліся гаварыць аб беларусах, бо доўгі здзек над нашым народам загубіў у іх душах сьмеласць вольных людзей; ешчэ іншые самі сумлеваліся, ці варта што казаць і дабівацца для беларусоў правоў. Вось усім ім з'езд паказаў, што дзеля вялікай справы народнай нельга баяцца ніякіх кар, што наша справа, як і украінская, знойдзе заўсёды шчырых прыяцелёў між лепшымі грамадзянамі ўсіх націй бязмежнай Расейскай дзержавы. Гэты з'езд павінен падняць ізноў нашу веру ў сябе і даць моц і надзею у змаганьні за правы і лепшую будучыну беларускаго народу.

**а—н—а.**

## Да нашых беларускіх інтэлігентоў.

„Будуйця, браты, будуйця!“

Гэтые словы адносяцца да вас, беларускіе інтэлігенты, да вас, каторым шчыра трэба працаваць, бо вы празрэлі дзеля будучыны свайго народу, каб заслужыць імя працаўнікоў на роднай ніве, а не адступнікоў ад народу і сьветлых агульна-людзкіх ідэалоў. І я вас, мае дарагіе сябры беларусы, чытачы „Нашай Нівы“, прызываю да працы, да вялікай працы, а найбольш мой прызыў адносіцца да вас, мае дарагіе вучыцелі. Вы павінны укладаць у душы дзяцей добрае насеньне, каб яны мелі хоць малое паняцьце аб сваей роднай мове, што яна такое, каб яны, будучы узрослымі с пашанай аднасіліся да ўсяго роднаго беларускаго, а не так, як на вялікі жаль, адносяцца другіе цяпер: глумяцца над тым, што трэба шанаваць. Дык вось якая праца перэд вамі, вучыцелі і вучыцелькі беларускіе! А каб гэту працу лягчэй вам было выпоўніць, трэба самім вам выпісываць нашу думку газэту «Нашу Ніву“. Інтэлігенты-беларусы! на вас ляжыць павіннасць устраіваць беларускіе чытальные кружкі, устраіваць беларускіе вечарынкі з беларускімі танцамі, запрашаць на гэтые вечарынкі селянскую моладзь з вёсак, вучыць яе добраго, вечнаго і паказываць усю красу свайго роднаго, каб народ скарэй забыў паскудные песьні, якіх на вучыўся у прыехаўшых з гарадоў «франтоў» і салдатоў, што вярнуліся дамоў. Калі вы, Беларускіе інтэлігенты, гэта ўсё, зробіця тады сьмела можна сказаць, што вы шмат дабра зрабілі для свайго народу і нагродай для вас будзе служыць сьвядомасць сьвята выпоўненай работы І так, ешчэ раз, паўтараю пастаўленае у пачатку гэтай стацейкі:

„Будуйця, браты, будуйця!“

**Пятрок з Вярхоўя.**

## Агульны сход Гуртка Навуковаго Пазнаньня Беларусі пры Пецярбурскім Унівэрсытэці.

У пятніцу 8 лістапада г. году адбыўся агульны сход „Гуртка Навуковаго Пазнаньня Беларусі“ пад кірункам прафэсара Розэнфэльда.

Пасьля выбору ураду, у каторы увайшлі студэнты: Тарашкевіч (філолог), Давідовіч (прыродавед), Грахоўскі (матэматык) і Алексюк (юрыст), былі дэманстраваны (паказываны) абразы нашай Беларусі і Літвы, прысланые у гурток прафэсарам Вольтэрам, вядомым спагадачом беларускаму адраджэньню; сярод іх было шмат цікавых і дужа арыгінальных. Пасьля студэнт Хлебцэвіч прачытаў характэрыстыку твbooў двох беларускіх паэтоў: Янкі Купалы і Якуба Коласа; дакладчык адзначыўшы асобнасьці твороў кожнаго з гэтых паэтоў, прачытаў дужа цікавы ліст Коласа у Гурток.

Калі скончыўся даклад, праф. Розэнфэльд звярнуўся да студэнтоў з дужа пекнай прамовай, у каторай заахвочываў іх да працы над пазнаньнем нашай бацькоўшчыны, да будовы нашаго жыцьця, да любові к роднай «разваленай хаткі, згніўшаго крыжа пры дарозі», бо як сказаў паважаны прафэсар мы гэта павінны любіць, бо ўсё гэта роднае. Вялікае ўражэньне зрабіла мова прафэсара на студэнтоў—шчыра віталі яны біцьцём у ладоні гэтые гарачые словы свайго кіраўніка.

У канцы студэн Тарашкевіч прачытаў колькі казак з віленшчыны, запісаных ім па мэтоду праф. Шахматова.

**Студ. Паўлюк Алексюк.**

## Жніво цемры.

Што дня газэты прыносяць нам весткі з усіх бакоў аб праступствах і зьверствах людзкіх. Загартаваліся ужо нашые нэрвы і ня чуім мы усяго страху гэтых з'яваў выродства, сьпяць нашые чуткі і сілы. нішто іх няможэ ўзбудзіць і крануць да справы збаўленьня грамадзянства. Часамі кажэм сабе: «э, гэта там недзе, далёка, дзе сусім іншы быт і людзі», або: «гэта з'ява выраджэньня цэлаго стану, каторы усё роўна па-

вінен загінуць». Але от на каранёх грамадзянства з'яўляецца гідкая пухліна; ці не страх гэта для цэлаго дрэва?

Факт гаворыцца каротка: у панядзелак пасьля Мікола адзін тутэйшы селянін, Тодар Карачун, жыўцом спаліў сваю жонку, замкнуўшы яе у сьвірні. Так толькі мусі і напішуць газэты — чужые газэты.—Але я раскажу гэтта дэталі, хоць тые, што чуў ад людзей (бо сам не бачыў), але усё роўна—пэўные,—гэтаж бо болька на нашым целі.—Карачуны—багатые селяне. Колькі гадоў назад купілі яны ў суполцэ с другім гаспадаром фольварак пры в. Куты (Мінск. губ. і пав.) валокі с 4 зямлі; тады яны і пераехалі сюды, а ўперад жылі недзе за Койданавам. Сем'я іхняя вялікая: бацька з маткаю, два сыны жэнатые і колькі ешчэ дарослых сынкоў і дачка. Кажуць, што ў хаці была вечная сварка: не любіла ўся сем'я старэйшаго сына, Тодара, чула, можэ, як ён яе знеславіць на ўвесь сьвет, а можэ і тое праўда, што кажуць людзі. бытцым ён ня гэтаго бацькі, хто іх там разьбярэ. Самая ж глаўная прычына—жонка Тодарава. Ці хто назводзіў, ці можа і напраўду было, ці сам сабе ў галаву убіў Тодар, што да яго жонкі ходзіць малодшы нежанаты брат. Жаліўся ён бацьку свайму, але давесьці, што гэта праўда ніяк нямог, дык спаганяў злосць на жонцы—біў яе часта і неміласэрдна, пакуль бацькі ці хатніе ні абароныць. За гэтую ж абарону, а можа і за ўсё іх аднашэньне зненавідзіў хатніх. І насьпела ў галаве яго страшная думка.—У панядзелак нашаму селяніну трудна вытрымаць, каб не паехаць у Мінск (нідалёка ён усяго тры мілі якіх)—ну там завязе што прадаць, або купіць чаго трэба. А каля Мікола зрабілася дарога—як шаса, самая езда. Дык у панядзелак і з'ехалі усе кутоўскіе мужчыны у Мінск—пазаставаліся бабы з дзяцьмі, а з мужчынаў—толькі адзін стары і нядужы чэлавек ды Тодар Карачуноў. Гэтаму толькі таго і трэба было. Усёж для пэўнасьці на хітрыкі паўшоў. Гэтак ужо пасьля поўдня кажэ жонцы; «злазь ты на гару на сьвіран, зьнімі начыньня сталярскае, буду калыску дзіцяці рабіць». Тая палезла нічога няведаючы, а ён тады сьвіран на замок,—жалезным путам замкнуў і патпаліў саломяные кулі. што стаялі пад сьвірнам Кажуць, што перад гэтым піў ён гарэлку. дзеля сьмеласьці. Йшчэ кажуць, што як яна стала прасіцпа, каб пусьціў, дык ён восім разоў падносіў агонь да саломы—усё ні рашаўся, а за восьмым разам падпаліў. Тады пабег схапіў дзьве стрэльбы, адну на плечы, другую ў рукі, набояў колькі дзесяткоў (сумысьля іх прыгатаваў), пісталет за пазуху і нож у халяву, — гэтак пайшоў вартаваць сваю ахвяру. А полымя рабіло сваё дзела... Адным с першых пабачыў дым лясьнік тутэйшы с панскаго лесу і прыбег ратаваць, аж бачыць—сам гаспадар на спатканьне. ды гэтак да яго: «ты чаго сюды!!—адыйдзі зараз а то страляць буду» — Той усёж ідзе, дык ён у яго стрэліў, той уцекаць, а ён ешчэ колькі разоў ў дагон. Пабачыў, каля сьвірна пазбіраліся суседзі.—ён у іх давай стрэляць. А з мужчынаў, кажу нікога не было. дык хтож пасунецца ратаваць. От ужо і стэха абвалілася схаваўшы у агні і попелі нешчасную мучэніцу.

Але цьвярдое сэрца меў Тодар Карачун, мала яму адное ахвяры, пабег шукаць братавай ды сястры, каб іх так сама забіць ды тые ужо не чэкалі, паўцекалі на вёску ды схаваліся. Тады падпаліў хату, ток, ўсе хлявы,—як маланкай яго насіла; стала матка—старая, нядужая—скаціну с хлявоў выганяць ён і ёй прыгразіўся але тая не збаялася: «стрэляй, кажэ, ўсё роўна сьмерць мая недалёка», — так і не адважыўся на яе руку падняць, ды мусіць і злосьці на яе ня меў. А суседзяў што хацелі тушыць будоўлю не падпускаў і агню тушыць: «тушыце сабе, кажэ, Вярбілаву частку (супольніка, што яны разам зямлю купілі), а нашай не кратайце». Пабачыўшы, што скаціна выйшла на поле, пабег, пастрэляў коні, каровы, а усё трапляў каб у грудзі. Урэшці надумаўся сябе забіць: увязаў стрэльбу у дрэва зачапіў аборкай за курок і нацэліўся у грудзі,—ды ні спаліла· нядобра неяк аборку прывязаў. Тады аддаў усё аружжа свайму прыяцелю, а сам пайшоў на вёску у тую хату, дзе былі яго дзеці і спакойна гаманіў увесь час, расказуючы усім, як ён надумаўся да свайго страшнаго чыну і як яго споўніў. Казаў, што вельмі узлосьціўся на жонку і на хатніх затое што яе баранілі, затым жэ і спаліў яё і скаціну пабіў. Усё рабіў у поўнай прытомнасьці. «Страшна было, кажэ, толькі пачаць, а як пайшоў усюдых агонь, дык неяк весела мне зрабілося». Успомніўшы аб бацьку і братох, хацеў ізноў ісьці, каб ім канец зрабіць, ды ўжо не пусьцілі. „Аднаго толькі, кажэ, шкадую, што йшчэ два чэлавекі не палажыў.“— Гэта ён пра бацьку ды пра брата. А тых суседзі. бачучы гэткую справу, перэнялі на дарозі з Мінску, дык яны і чэкалі, пакуль ўсё ня скончылося. Далі знаць паліціі, прыехаў стражнік яго ўжо вязаць, ён і сам залажыў рукі за сьпіну: „вяжыце“. А тым часам ужо і ноч спусьцілася, пазьежджаліся гаспадары з Мінску, ды ўжо нічога адратаваць ня можна было Спалілася уся чыста будоўля Карачунова, а супольнікаў згарэў толькі ток. З людзей нікога ні раніў, са скаціны колькі штук забіў, а то параніў цяжка.

Аж аткапалі нябошчыцу с пад руінаў сьвірна знайшлі яе тамака у засеку у аўсе. хацела мусіць схавацца ат сваёй страшнай сьмерці, ды дзе там!..—Забойца прыме цяжкую кару, яго жонка у страшных цярпеньнях адыйшла у лепшы сьвет. Але ці на гэтым скончыцца страхацьцё нашаго жыцьця, ці з гэтым згіне страшная змора людзкаго зьверства? Цяжкім камянём узвалілася яна на ўсіх каму давялося пабачыць яе чорные крыльля, праз усё жыцьцё будзе яна мучыць нешчасных дзяцей-сіротаў, а можэ барані Бог, ускладзе сваю печатку і на душу усяго грамадзянства. — Сьветлые людзі маёй старонкі! Хай не ўстрашыць вас гэты абраз людзкой дзікасьці, хай ні атпіргне ён вас ад таго народу, над долею катораго умыўшы рукі, вы адыйшлі былі у бок. Калі, бліскаючы маланкамі, падходзіць у летку страхацьцё неба, сьмертаносная хмара,—ямчэй кіпіць праца на полі, з апошніх сіл выбіваюцпа людзі, каб уратаваць хоць часьціну Божаго дару. Ідзіце ж і вы да меньшаго брата з вашай крышталёваю маральлю, з вашымі лепшымі, векамі гадаванымі пачуцьцямі хараства асьвечайце яму сьцежкі жыцьця сьвятлом вашаго розуму, бо калі будзіце толькі умываць рукі, віна пралітай крыві і сьлёзаў людзкіх ўпадзе на вашые галовы, бо вы шмат маеця, шмат здабылі праз сілу і пот мужыцкі, усё вашае багацьце матэр'яльнае і духоўнае. Супольнымі сіламі, пакінуўшы національную і рэлігійную грызьню павінны узяцца усе жывые сілы старонкі нашай за цільную працу над прасьвятленьнем цемры вясковаго жыцьця і рабіць гэта не дзеля тых ці іншых дачэсных ідэалоў, а дзеля вечнай праўды сумленьня людзкога, дзеля яснай для ўсіх будучыны.

**Арцём Жывіца.**

*в. Куты, Мінск. пав.*

## Па моры жыцьця.

**П. Ныркову.**

Па моры жыцьця, ад сябе у аддалі,
Чужые сабе, — мы плылі,
Ды вось зашумелі спакойные хвалі—
І нашые чоўны супольна сагналі
І разам нас ў перад няслі.

Цяпер мы ўжо сталі сабе нечужые:
Нясённые хваляй аднэй—
Супольные мелі мы мэты сьвятые,
К каторым рваліся душы маладые—
І многа супольных ідэй..

Мо зноў разнясуць нас бурлівые хвалі
Калісьці,—хто-ж зможэ згадаць,—
Дык помні-ж брат, думкі. што нас так збраталі,
Яные-б нас буры ў жыцьцю не спаткалі—
Мы сьвята павінны споўняць!..

**К. Буйло.**

## Паэту Арлу.

Сумна, праўда, — сэрцэ плачэ,
Хаця дзіўны Божы сьвет,
Але-ж можэ быць іначэй,
Родны, мілы наш паэт.

Хмаркі хвалямі высока
С поўным месяцам плывуць

## Як кум у кума масла украу.

Жылі у аднэй вёсцы два кумы. Адзін зваўся Паўлюк, а другі — Міхалюк. Паўлюк занімаўся гаспадаркай, а Міхалюк меў дробную крамку. Жылі яны абодвы у дастатках і навет багата, затое і пакуміліся. Часта звалі адзін другога у госьці і прынімалі з бутэлькай манапалькі і каўбасамі, ці яечняй, ці чым іншым, што там ужо кума здумае зрабіць.

Адзін раз, зімой, Паўлюк вертаўся с сякерай з лесу дамоў і зайшоўся да кума у крамку пагукаць. Кум Міхалюк пряняў кума добрым вечэрам і падсунуў яму табакерку, ды прасіў, каб ён сеў, а сам пачаў падаваць пакупцом пакупкі. Каму фунт цукру, каму пачак табакі, сернікоў, — каму мыла. Трэба адмеціць, што вёска была вялікая, а у Міхалюка у крамцы было усе патрэбнае у вясковым жыцьці, то і торг ішоў бойка.

Кум Паўлюк пасядзеў крыху і убачыў, што перад ім, на паліцы, лежаць клубочкі масла адважэные па фунту. А у яго ужо, як на тое, усё масла вышло, бо, прызнацца, любіў ён яго с цёплай бульбай на вячэру. Успомніў Паўлюк, што якраз цяпер баба, пэўне гатуе на вячэру бульбу і калі Міхалюк наліваў аднэй дзяўчынцы у бутэльку газы, Паўлюк узяў адзін камок масла ды палажыў у шапку і надзеў на галаву. Шапка у Паўлюка была вялікая, зімовая, з аўчыны і закрывала галаву аж да шыі і ані не было заметна што там лежаў фунт масла. Але Міхалюк мусі неяк гэта уцяміў, бо калі ужо Паўлюк хацеў пайсці дамоў, то Міхалюк яго затрымаў кажучы:

— «Пачэкай, кумок, трошкі. даўно мы ўжо с кумам не бачыліся! Я, вот ужо, запру краму і пойдзем камне у хату, пасядзім крыху і пабалакаем што небудзь Нават і мая баба успамінала ужо кума. што ніколі не зайдзешся да нас... Нешта кум многа гонару набраўся, ці што?“—І з гэтымі славамі замкнуў кум Міхалюк крамку і павёў Паўлюка к сабе у хату.

Паўлюк ня вельмі хацеў захадзіцца, але кум так прыстаў да яго і сілай зацягнуў у хату. Калі увайшлі яны у хату, то Міхалюк сказаў:

— „Не знімай, куме, шапкі, бо у кума на галаве валасоў мала (Паўлюк быў лысы), а мая хата сягоньня сцюдзёная». І клікнуў бабу. Тая прывітала кума Паўлюка і пашла прынесла перш дроў, а посьле поўбутэляк гарэлкі.

Кум Міхалюк падсунуў табурэтку да самай чугуннай печкі.

— «Сядай, -кажэ,—куме, тут. Зараз затопім печку, то хоць сагрэемся!“ І сам зацёр свае рукі сказаўшы:—„Іш які мароз драгануў!“ А посьле пашоў і нешта шэпярнуў бабі на вуха і сам сеў ля кума пры стале і пачаў, адаткнуўшы наліваць гарэлку. Выпіў сам чарку і наліў куму і пачалі выпіваць закусываючы хлебам. А кума у гэты час растапіла у печцы агонь і наклала паўнютку печку сухенькіх паленцаў, каторые за некалькі мінут так пачалі шугаць, што аж печка зачырванелася.

Пачуў кум Паўлюк, што яму ужо добра цёпла зрабілося, што на галаве, дзе ляжыць масла, нешта робіцца мокра і прыкра. Хацеў крыху адсунуцца ад печкі далей, але з другога боку сядзеў кум Міхалюк так блізка, што ня можна было зрабіць гэта. Пачаў Паўлюк гаварыць, што пара яму дамоў ісці, што ужо позна і баба будзе баяцца, чаму яго німа ешчэ з лесу. Але Міхалюк наліваў яму чарку за чаркай гаворучы:

—«Э, што там, кум! З бабай пастаянна жывеш, а да мяне рады — ў гады трапіўся.. Пасядзі ешчэ трохі, выпій во, ешчэ адну чарку і тады сабе пойдзеш».

І хоць кум Паўлюк праклінаў у мысьлях гэту гарэлку і кумаву ласку, але аніяк ня мог аткараскацца ат кума, хоць ужо чуў, як масла пачало сунуцца с плеха, праз валасы, каля вушэй.

Кум убачыўшы, што у Паўлюка ужо пот выступіў і с пад шапкі, каля вушэй. сплываюць масьлянные каплі кажэ:

— „Добра, куме, крыху забавіліся.. Дзякуй што зайшоўся.—ідзі сабе цяпер да хаты... Але, ведаеш, куме, што цяпер гэткі мароз на дварэ, а кум крыху угрэўся у мяне, аж спацеў, то захініся добра каб часам не праступдзіўся». І з гэтымі славамі паправіў кум Міхалюк куму Паўлюку каўнер, захінуў кажух і паціснуў моцна на галаве шапку, каб вушы схаваць. А у Паўлюка с пад шапкі пена паплыла па твары і па шыі за каўнер.

— „Ну, цяпер ідзі з Богам!“—Сказаў Міхалюк, а Паўлюк нічога не сказаўшы хутка пашоў да хаты.

І хоць, здаецца, яны добра разышліся, але посьле гэтаго саўсім перэсталі схадзіцца, толькі іх бабы часта схадзіліся і пры гаворцы нечага усё усьміхаліся.

**Мікола Аўрэйцэвіч.**

Дый ня цешыць гэта вока,
Калі жальбы ў нас жывуць.

Сумна, смутна, і ня дзіва!
Зато маеш дзіўны дар
Пеяць сільна і праўдзіва...
Так спевай-жэ, наш песьняр!

I у песьнях мкні высока
Ад зямліцы ў ясну даль,
Ў морэ ты ўтапі глыбока
З душы смутак, с сэрца жаль

**Сяброўка.**

## Трыолет.

I мой ахвярнік не астыў.
Гарыць ешчэ агонь на ім
I рвецца ў гору сіні дым..
I мой ахвярнік не астыў,
Магу сказаць во гэта ўсім,
Хто мае песьні палюбіў:
I мой ахвярнік не астыў. —
Гарыць ешчэ агонь на ім.

**А. Петрашкевіч.**

**Просім сваіх чытачоў і прыхільнікоў еднаць падпісчыкоў для „Нашай Нівы": чым болей будзе падпісчыкоў, тым хутч эй пойдзе справа адраджэньня Беларусі і тым абшарнейшую і лепшую зможэ Рэдакція даваць газэту.**

# З Беларусі і Літвы

## З Віленшчыны.

### Вільня.

Апошнімі часамі праз Лібаву вертаецца многа эмігрантоў з Амэрыкі. Найболей вертаецца беларусоў і літвіноў. На адным параходзе вярнулося з Амэрыкі 1.500 чэлавек. Прычына павароту, як кажуць, тая, што нехватае там работы і жыцьцё сталося у Амэрыцы дужа дарагое.

### С пад Валожына.

У адным з нашых блізкіх маёнткоў (Ашмянск. пав.), жыў сабе панок і усё у яго ішло, як па масьлі, толькі адна беда, што небыло у яго дзяцей; і, як казалі, яго паня паехала некуды палечыцца ад гэтай немачы. А тымчасам гэны з вялікай нуды па сваей пані узяўся загуліваць с пакаёўкай, ды так шчыра, што ажно на ей палопалася сарочка, і усё былобы ціха і гладка, каб ні тая наша мужыцкая дурнасць. Дурная дзяўчына, заместа таго, каб быць паслушнай пану, затое што ён ня гідзіцца ёю, выляцела надвор ды нарабіла крыку, а, што горш, наняла хурманку ды паехала да... сьледаваццеля. А той узяўся як за нітачку і цягне пана да следзтва. I німаш ведама чым гэта справа скончыцца.

Посьле чуць ня ў тым самым мейсцы нейкае ліха зрабілося мейсцоваму арганісту: ён пакінуў сваю родную жонку і дзяцей а сам паехаў у Амэрыку. Усяк людзі аб гэтым пагаварываюць. Адны кажуць, што ён палез да чужой бабы, а там яго прыпынілі ды далі парадную лупцоўку. А другіе ізноў гутарацць іншае, што да яго кабеціны нехта падкаціўся і ён яе саўсім адрокся.

А у трэйцім мейсцы у аднаго сытога пана была адна худзенькая дзяўчынка і таей дзяўчынцы даў Бог неяк маленькаго хлопчыка, дык яна яго вылегчала (вы паклáдала) ды... у комін! Але там неяк пачулі піск, ды дасталі яго с сапухі. Яно крыху паціўкало, паціўкало ды і памерло. Тады яна яго у скрыначку ды у старую бульбяную яму. I тут было-б ціха каб людзкіе языкі не набрэхалі у паліцію. Тут і пашло! Вураднік, дохтар, сьледавацель. *«Свой».*

### Выстаўка у Друі.

Друйскі сельска-гаспадарскі кружок атрымаў пазваленьне на устройства у Друі 1914 гаду сельска гаспадарскай выстаўкі з аддзелам хатняго рэмесла. У часе выстаўкі маняцца чытаць лекці для селян. Пара ўжо нашым аграномічным і сельска гаспадарскім установам пайсці сьледам украінскіх, латышскік і др. падобных установ і чытаць народу лекціі на зразумелай мове. *«S».*

## З Міншчыны.

### Мінск.

Аддалі пад суд Рэдактароў «Вечерняй Гагэты», „Голоса Бѣлостока". „Русской Молвы" і «Биржев. Вѣд.» за надрукаваньне непраўдзівых вестак аб катаваньні арэштаваных у Мінскай сыскной паліціі, у тых газэтах пісалося, што нібы пры выпытываньні, арэштаваных мучылі электрычнай машынай.

### м. Любешоў (Мінской губ. Пінскаго павету).

У ночы с 13 на 14 сьнежня у сяле Кухоцкай Волі невядомы злодзей праз акно улез у хату Беркі Годінэра, хацеў абкрасьці яго. У хаці Годінэра знаходзіўся тады толькі ён і яго жонка, хворая на вочы, і абое яны спалі, але ноччу Годінэр прачнуўся і ўбачыў, што да яго пасьцелі, дзе ён спаў, нічога не гаворучы, надбліжалася хвігура чэлавека. Твар гэтай хвігуры быў закутаны ручніком і толькі між шапкай і ручніком відаць былі вочы, а у аднэй руццэ была маленькая запаленая газніца а у другой руццэ—вялікая каса́ (без касься). Убачыўшы гэта Годінэр сказаў злодзею, што ён ўсё аддасць яму па добрай волі, абы толькі ён заставіў яго жывым. Падыйшоўшы да куфра, дзе ляжалі грошы, злодзей хацеў украсьці іх адтуль, але Годінэр учапіўся за яго ззаду і падняў гвалт Злодзей паабдзіраў рукі Гадінэру, вырваўся ад яго і уцёк, пакінуўшы тут жэ касу і газьніцу. На заўтра Годінэр па сьвітцы, шапцы паяску і хвігуры апазнаў у гэтай справе селяніна Янку Кудрыніцкаго.

Кудрыніцкаго паліцэйскіе заарыштавалі і адаслалі у Пінск на казённы хлеб. *Пятрукоў М.*

### С пад Пінска.

У пінскім павеці прабуджаецца беларускі рух. Пішучы гэта сам чуў як адна памешчыца беларуска загадала свайму служачаму, каторы гаварыў з ей на „культурнай расейскай мове, гаварыць па беларуску. Часы, калі гаварыць у сваей мове лічылося у беларусоў „мужыцтвам" даўно мінуліся. Астаецца пажадаць толькі, каб усе памешчыкі беларусы пайшлі сьледам тэй патрыоткі-памешчыцы, тады-б нашы селяне сталі-бы болей шанаваць мову сваіх прадзедоў. *Argus.*

### З Барысоўшчыны.

Барысоўскае земство пазволіло прамыслоўцам пусціць самаходы паміж станціей Барысоў і горадам Барысавам, а такжэ паміж Барысавам і Зембінам.

### З Бабруйшчыны.

Бабруйскае земство аткрыло рэмесьленную школу у каторай будуць плясьці карзінкі, мэблі і іншае з вярбовых дубцоў, с чароту, травы, бяросты і др Навука у школі трохгадовая. У школу-майстэрню прыймаюцца дзеці селян бабруйскаго павету, не маладзейшые 12 гадоў. Прыездным вучням, асабліва з далёкіх 'сяліб, земства будзе выдаваць па 10 кап. у дзень на харчы.

### Пажар.

У фоліварку Ценебехаве, Мінск. губ Слуцк. пав, Вызненскай валасьці, згарэла адрына с канюшынай у ночы с 21 на 22 сьнежня.

Гэтай самай ночы згарэло гумно у фоліварку Манькове, Слуцк. пав. і кажуць, што усё жыта згарэло у гумне *Жук.*

## З Вітэбшчыны.

### Муж жонку зьеў.

Каля нас (Вітэбск. губ. Лепэльск. пав.) чуваць, што недзе каля Даўгінава муж жонку зьеў. Кажуць, было гэта так: любіў дзяцюк дзьве дзеўкі, адну у сваей вёсцы, а другую у суседняй і тэй, што у суседняй прыстараўся бахура, а з бліжэйшай ажаніўся. Прайшло некольні часу, паехаў ён у Даўгінава на кірмаш і спаткаўся там с тэй дзяўчынай Яна запрасіла яго у карчму на падвячорак і там дала яму з'есьці два піражкі. Калі ён прыехаў дамоў і селі вячэраць за стол Грызь ён жонку за плячо. Ну,—кажэ жонка,—здурнеў ты ці што! Гэтак укусіў, як сабака! — А ён ешчэ. Бацька відзіць, што ён дрэнна жартуіць, трах яго лыжкай у лоб. Лягли спаць. Назаўтрае як усталі, то знайшлі ад кабеты толькі косьці, а ён увёсь у крыві, наеўся як бочка, вочы вылупіў, нічога не гаворыць і зара і сам памёр. Гэта я чуў ад цёткі Алены, а ей баілі у Струкоў дзе яе дачка замужам і ніяк ня мог дазнаць я лепей, ці гэта толькі можэ дзе званы адліваюць ці і ўзапраўды нешта падобнае было Каб аб гэтым напісаў той, хто бліжэй і лепей гэта ведае. *Н А*

### Сельска-гаспадарскіе курсы.

У вёсцы Слабодзе, Лепэльскаго пав., пры Ім Тяпінскім народным вучылішчы 16 лістапада 1913 году аткрыліся Сельска-гаспадарскіе курсы, каторые павінны быць да 30 марца 1914 г. Лекціі тут дае вучоны аграном ягомасць М Плавскій. На курсы сцікаюца многа гаспадароў з гэтай і суседніх вёсак, акром гаспадароў бывае ешчэ мейсцовая інтэлігенція: бацюшка, дыякан, вучыцелі і др. Ўсе асобенна гаспадары, з вялікай цікавасцю слухаюць лекціі. Некаторые жыхары пасьля лекціі, хочучы прадоўжыць бясёду по гаспадарству задаюць ад сябе пытаньня і палучаюць на іх разумные атказы ад ягомосьці Плаўскаго.

Ўсе слухачы лекцій выражаюць сэрдэчную падзяку Высокапаважанаму ягомасьцю Плаўскаму і яго памошчніку за іх вялікіе труды на карысць беларускаму люду. *Х. I—н.*

# З усіх старон.

### Вучыцельскі зьезд.

Камісія аб інародчэскай школе пастанавіла такую рэзолюцію аб украінскай школе: 1) каб у школах агульных і профэсійных ў мейсцовасцях з украінскім насяленьнем, навука была па украінску; 2) каб навучаньне расейскай мовы, як абавязковаго прэдмету пачыналося с трэцьцяго году навучаньня і было пастаўлена на патрэбнай вышыне, а такжэ навучаньне гэтай мовы каб было увольнена ад служэньня „пастаронным мэтам"; 3) каб было заведзена навучаньне у украінскай мове гісторыі і географіі краю; 4) каб школьные кніжкі былі дапасаваны да варункоў мейсцоваго жыцьця; 5) каб навучаньне на другой ступені пачатковай школы, а такжэ усё дашкольнае і пазашкольнае навучаньне вялося у мейсцовай мове; 6) каб у бібліотэках у мейсцовасьцях з украінскім насяленьнем былі кніжкі у украінскай мове; 7) каб у вучыцельскіх сэмінарыях, і у пэдагогічным класе жаноцкіх гімназіі на тымчасовых пастаянных вучыцельскіх курсах было заведзена, дзеля падгатоўкі вучыцьлёў, навучаньне украінскай мовы, гісторыі, літэратуры і географіі краю; 8) каб у вышэйшых школах у мейсцовасьцях з украінскім насяленьнем былі заложэны кахедры украінаведаньня.

### Агітація саюзнікоў.

Саюз Архангела Міхаіла с Пурышкевічам наперэдзі вядзе шырокую агітацію проці з'езду панароднай асьвеці.

### Папечыцель проці асьветы.

Вядомы рыжскі папечыцель Шчэрбакоў разаслаў цыркуляр, у каторым забараняе прасьветным таварыствам без асобнаго ад папячыцеля пазваленьня устраіваць сыстэматычные чытаньня і лекціі, бо яны маюць характар «курсоў»

### У абоймах мерцьвека.

Да нейкаго Рэшатава прыехала у Маскву. на куцьцю з вёскі яго палюбоўніца Дмітрэва. Вечэрам раптам Рэшатоў сканаў, абняўшыся у абоймах Дмітрэвай, ад разрыву сэрца. Рукі нябошчыка гэтак крэпка абхапілі Дмітрэву, што яна не магла расчапіць іх. Усю ноч яна пралежала у абоймах мерцьвяка. Раніцай суседзі пачулі яе стогн і прышлі на помач Але ніяк не маглі расшчапіць рукі мерцьвека. Толькі чатыром мужчынам пажарнікам удалося разцягнуць нябошчыкавы рукі. Дмітрэва прабыўшы цэлу ноч у абоймах мерцьвяка саўсім пасівела, атабрало ей ногі і яна блізка утраты розуму.

### Добры вучыцель.

У Калузі на літэратурнай вечарынцы, вучыцель жаноцкай гімназіі Соловьёв ударыў рукой па твары, а посьле палкай, гімназістку 7 класу затое, што яна не хацела, каб Соловьёв адвадзіў яе з вечарынкі дамоў. Гімназістку выгналі з гімназіі, а Соловьёв і далей вучыцельствуе.

### Штраф на газэту.

Рабочым газэтам страшэнна не ручыць у Расеі, што якая аткрыецца, то яе заціскаюць штрафамі, або і прама такі закрываюць Гэтымі днямі напрыклад аштрафавалі „Новую Рабоч. Газ." на 500 руб

### Убіўства.

У Астрахані 30 сьнежня нейкі невядомы забіў двох гарадавых і параніў звозчыка. Праступніка арэштавалі.

**Пытайцеся ва ўсіх кнігарнях і у кніганошаў „Беларускаго Календара" і беларускіх кніжэк. Календар сёлета выйшоў двумя асобнымі выданьнямі (руск. і лацінскімі (польскімі) літэрамі) з розным тэкстам. У календары лац. літэрамі надрукавана 17 набожных беларускіх песень.**

## У мутным віры.

Пад гарою ў селяніна
Конь прыстаў да рэшты:
Бедны змучыўся, ні з мейсца,
Хоць яго зарэж ты!

Селянін ужо і ласкай:
—„Но! Цягні вашэці!

Бо інакш, напішуць брыдка
Аб табе ў газэці...

А яму конь: „Ніхай пішуць,
Раз такой натуры,
Адно ты пакінь пісаці
На маей жэ скуры“.

К—а.

## ЖАРТЫ.

*Вураднік:* Як ты асьмеліўся, шэльма, рабіць фальшывые грошы?
*Вінаваты:* Бо бачыце, пане вураднік, праўдзівых аніяк ня зробіш...

**Усім новым гадавым і поўгадавым падпісчыкам на 1914 год у прыдатку да „Н. Н.“ будзе разослан „Беларускі Календар“.**

Рэдактар выдавец
**А. Ўласоў.**




Вільня кантора **ДѢЯТЕЛЬ** Вялікая 32 Тэлеф. 178.
**Рэкамэндуе:** упраўляючых, эканомоў, пісароў, гаспадынь, усякіх інтэлігентных служачых і дамовую прыслугу.

Толькі **БЕЛАРУСАМ** селянам
прадаюцца вучасткі зямлі у іменьні Гай, каля самаго гораду Пінска. Задатак па 20 руб. ад дзесяціны, разсрочка платы на колькі гадоў па 6%. Асабліва важна для агароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.
**Э. Зуземіль, ім Гай, каля гор. Пінска (Мінск губ.).**

У дварэ Дзержаны, почта Эйрагола, Ковенск. губ. **маюцца на продаж прывозные з Бэльгіі жэрабцы** Ардэны і Брабансоны, а такжэ прывозные з Англіі Сгіры (Shiry). **Прадажа і на раты.**

**Пахвінные бандажы.**
Важна для хворых кілой. Раблю спэціальные бандажы для кожнага хвораго кілай, каб немучыўся ад гэтаго болей, я выробляю цяпер без спружын г. зн. гумілястыкавые, зробленые па навейшай сыстэме інжэнера—Ортопэда „А. Клаверы“ с п ыжа. Я раблю розные сарты дамскіх бандажоў, набрушнікі, почачные бандажы: а такжэ бандажы розных сартоў для дзяцей.
**Заказы выпаўняюцца скора і акуратна**
Адрэс: **бандажна — ортопэдычная майстэрня І. Хілісбэрга, Вільня, Благавешчэнская вул. д. № 14. Фірма бытуе ад 1890 г.**

# Беларуская кнігарня

**Вільня, Завальная, № 7.**

Мае на прадаж у агранічэным чысьле экз. такіе кніжкі:

«Старый Статутъ Литовскій 1529 году». (Перадрук літэра ў літэру з орыгіналу). . . . . . . 5 р.
«Статут Великаго Княэства Литовскаго 1588 г.» (Перадрук літэра ў літэру з Мамонічоўскаго выданьня . . . . . . . . . . . . . . . 5 р.
«Бѣлорусскій словарь» Носовіча . . . . . . . 5 р.
«Бѣлорусскіе народные пѣсни», Запісаные А. Розенфельдомъ . . . . . . . . . . . . . . 1 р.
«Бытъ Западно-Русскаго селянина» Ю.Крачковскаго 1 р. 50 к.
«Сборникъ Бѣлорусскихъ пословицъ». Сост. Носовичъ . . . . . . . . . . . . . . . . . 1 р.
«Очерки Бѣлорусскаго Полѣсья». И. Е емича . . — 80 к.
„Сказки і разсказы Бѣлоруссовъ-Полѣшуковъ“. А. Сержуптовскаго . . . . . . . . . . 1 р.

**Цэны без перасылкі почтай.**

# Курсы языкоу і шчотаводзтва
# Э. П. ПАЭГЛЕ

Рыга, Бл. Неуская, 28.

Пачатак заняцьцёў 10 студня. Варункі высылаюцца на жаданьня.

**ДАСТУПНА КОЖНАМУ** купіць вучастак зямлі у „Звярынцы“ у самай лепшай часьці гораду Вільні. Мейсцовасць прыгожая, здаровая лес, рэка.
Цэны і варункі выгодные.
С купляй пасьпешайця: зямлі асталося саўсім мала! Гэта—апошні раз напомінаецца.
За справкамі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня „Звярынец“, Георгіеўскі праспэкт, д. № 48. Тэл. № 46.
**Спраўкі выдаюцца праз увесь дзень, не вылучаючы і сьвят.**

# НА СЬВЯТЫ!
# Т-во „ПРАВАДНІК“

Віленскі аддзел: Вялікая вуліца д. № 96.

## ВЯЛІКІ ВЫБОР:

**Галёшы** дамскіе, дзяцінные і мужчынскіе—розных фасоноў і для ўсякаго абуцьця
**Лінолеум** дываны, дарожкі—мастацкіх узороў.
**Цацкі** гумілястыкавые і машыстовые
**Скарбонкі** амэрыканскіе аўтоматычные, каторые зачыняюцца як укінуць першую дзесяцікапеечную ці пяц рублёвую манэту і атчыняюцца, як укінуць 50 манэт.
**Плашчы** непрамакаючые.
**Гумілястыка** для выціраньня з рысункамі.
**Стірацін** Іван, Барыс, Роза Жэня і др. Staś, Jaśgienka, Zofia, Zagłoba).
**Мячы,** хлысты.
**Гумілястыкавые** прыборы для гімнастыкі.
**Падушкі** падарожные.
**Баллоны** для пульвэрызатороў.
**Прапоеная гумілястыкай** тканіна.
**Цырата** розныя, сарвэты, дарожкі—расейск. і заграничные.
**Грэбяні** мастацкіх фасоноў, тые-ж у падарачных гарнітурах.
**Сьнег** негаручы для ёлак.
**Шыны** для аўтомобілёў і павозак.
**Буфэры** для брычэк і дзьвярэй.
**Наканечнікі** для лясак.
**Фартушкі** для дзядей
**Прэзлі** і многа другіх гумілястыкавых вырабоў.

**Заказы выпаўняюцца с пісем і па тэлефону №10—13.**

**Галёшы** элеганцкіе Фасоны — поуная парука
**Лінолеум** грамадны выбор
РЭКОМЭНДУЕ:
# Т-во „ПРАВАДНІК“
**ВІЛЕНСКІ АДДЗЕЛ**
**Вялікая вуліца д. гр. Тышкевіча № 96.**
**Тэлефон № 10—13.**

НА ФАБРЫКАХ
# Т-ва „ПРАВАДНК“
заўсёды патрэбны
# РАБОТНІЦЫ
**узростам ад 15 да 30 гадоу — штодзенная заняцьце ад 8—10 гадзін.**
ФАБРЫКА ЗНАХОДЗІЦЦА:
у гор. **РЫЗЕ,** Ліфляндскай губэрні па **ВЫГОННАЙ ДАМБЕ № 3.**
**Таварыство Русско-Французкіх фабрык гумілястыкавых гутапэрчэвых і тэлеграфных вырабоў пад фірмаю „ПРАВАДНІК“.**

**Выйшлі з друку новые**
**ПРАГРАМЫ** агульна кштаптуючыхъ і спэціяльных прэдметоў віленскай васміклясовай **КАМЕРЧЭСКАЙ ШКОЛЫ** са ўсімі дапаўненьнямі і пераменамі, выданьня 1914 году. Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях.
Складъ выдавецтва у кнігарні **„ТРУДЪ“** ВІЛЬНЯ, Вялікая вул., № 72.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.